ISSN 2351-6658
ISSN (ONLINE) 2351-6666

# ШТОДЗЁННАСЦЬ ГАБРЭЙСКІХ ДЗЯЦЕЙ НА БЕЛАРУСІ XIX СТАГОДДЗЯ Ў СВЯТЛЕ МЕМУАРЫСТЫКІ

ЯНІНА КАРПЕНКІНА

***Анатацыя:*** У дадзеным артыкуле аўтарка імкнецца раскрыць тэму штодзённасці дзяцінства габрэйскага насельніцтва Беларусі ў XIX стагоддзі, абапіраючыся на мемуарныя крыніцы канца XIX – пачатку XX стагоддзяў Пры гэтым ставіцца задача максімальнага адыходу ад стэрэатыпаў у дадзенай праблематыцы, дзе іх сапраўды нямала. Артыкул ўяўляе сабой паслядоўны разгляд розных, найбольш важных з пункту гледжання аўтаркі, аспектаў жыцця габрэйскай дзятвы азначанага перыяду: хэдэр, вольны час, этнаканфесійныя стасункі з аднагодкамі іншых народаў, адносіны са сталымі.

***Ключавыя словы:*** штодзённасць, дзіцячы свет, хэдэр, меламед, гульні, вольны час.

# THE EVERYDAY LIFE OF JEWISH CHILDREN IN THE 19TH CENTURY BELARUS IN THE LIGHT OF MEMOIRS

***Abstract:*** In this article, the author tries to reveal the everyday life of childhood of the Jewish population of Belarus in the 19th century relying on the memoirs. The author tries to avoid the stereotypes in this subject, which are numerous indeed. The article presents a consecutive review of most important aspects of life of the Jewish kids of that period: heder, free time, ethnic and confessional relations with peers, relations with adults.

***Keywords:*** Everyday Life, Child`s World, Heder, Melamed, Games, Leisure Time.

У артыкуле ставіцца задача прасачыць, чым жылі дзеці дадзенай этнічнай супольнасці ў гэты перыяд, што іх хвалявала, як яны бавілі час і гэтак далей. Для гэтага скарыстаемся мемуарамі.

**Хэдэр.** Многія аўтары-мемуарысты (Паперна, 2000; Цетлин і інш.) апісваюць хэдэры настолькі ўбогімі, што сучасны чытач прыходзіць у шок: маленькая хатка меламеда, якая ледзь не валіцца на зямлю; цесны брудны пакойчык, дзе даводзіцца туліцца не толькі вучням з меламедам, але і яго жонцы, дзецям, курам; маленькае бруднае вакно, якое зусім не асвятляе хатку; занадта высокія для вучняў лавы і гэтак далей. Аднак нягледзячы на неадпаведнасць тагачасных хэдэраў цяперашнім элементарным санітарным і гігіенічным нормам, варта зазначаць, што такія ўмовы жыцця былі рэаліямі таго часу. Іншая справа – выкладанне навучальнага матэрыялу часцей за ўсё праходзіла нецікава і нудна, што зусім не спрыяла росту папулярнасці хэдэрнага навучання сярод тагачасных вучняў. Дзеці былі гатовы займацца чым заўгодна, абы не вучыцца. А з гэтага боку габрэйская сістэма навучання нагадвае нашу сучасную. Таму не будзем занадта крытычнымі.

**Вольны час.** Існуе стэрэатып, што яўрэйскія дзеці з'яўляліся пераважна, як бы мы выказаліся на сучасны манер, “дамаседамі”: увесь час вучыліся, нічога не бачылі ў сваім жыцці, акрамя Торы і Талмуда. Таму, у выніку баўлення часу пераважна ў доме, былі фізічна неразвітымі, кволымі, і наогул страшэнна баяліся далёка адыходзіць ад габрэйскіх кварталаў.

Дадзены стэрэатып бытаваў не толькі сярод хрысціян, але і сярод саміх юдэяў. Напрыклад, пашыранасць яго ў габрэйскай супольнасці фіксуе Уладзімір Восіпавіч Гаркаві: “Мальчик всегда должен учиться, играть можно только по праздникам, и то тихо, без шума” (Гаркави, 1913: 231).

Аднак, нягледзячы на прэстыжнасць статуса “завучкі” ў габрэйскай супольнасці, рэальна вельмі малы адсотак дзяцей з'яўляўся такім. Той жа самы У. В. Гаркаві піша, што любімым баўленнем часу яго і ягоных аднагодак-суседзяў былі гульні: жмуркі ў двары і хованкі (Гаркави, 1913). Успаміны Шалом-Алэйхэма насычаны апісанямі дзіцячай гарэзлівасці, чаго варта толькі цытата: “...где уж там молиться, когда на дворе сияет солнце...” (Шолом-Алейхем, 1957: 56). І-Й. Зінгер піша: “Я смотрел в книгу, которая говорила о том, что в этом мире все суета сует, и ненавидел ее за это. Меня тянуло играть, тянуло (...) к солнцу и к ветру, к воде и к ребятам. Мир не был суетой сует, он был невероятно красив и полон радости” (Зингер, 2013: 35), – і прыгадвае свае штосуботнія ўцёкі з дому да хлопцаў.

**Гульні.** Усе гульні габрэйскіх дзяцей у той час можна ўмоўна падзяліць на святочныя (у якія было прынята гуляцца ў пэўныя святы)

і штодзённыя. Да святочных гульняў габрэйскай дзятвы, напрыклад, можна аднесці: гульні ў карты, гульні з дрэйдлам (Ханука), кіданне чартапалохам адзін у аднога (9-е Ава), гульні ў арэхі (Пэйсах); да штодзённых – жмуркі і хованкі, пятнашкі, хлапечыя вайнушкі, гульні з цацкамі, у фанцікі і нават гульні у хапераў (Зінгер, 2013). Зразумела, што гэты пералік гульняў не з'яўляецца поўным. Што да падзелу на святочныя і штодзённыя гульні, то ён вельмі ўмоўны, як было сказана, бо часта пэўная гульня, у якую прынята было гуляцца на святы, так зацягвала дзятву, што ў яе гулялі яшчэ доўга пасля завяршэння святкавання. Такімі былі найбольш азартныя гульні: у арэхі і ў карты. Гульня ў арэхі, хоць лічылася забавай на Пэйсах, заставалася найпапулярнейшай гульнёй на працягу ўсяго года (гэтая гульня прыгадваецца ў яўрэйскай мемуарыстыцы найчасцей за іншыя). Існавала шмат варыянтаў гульняў з арэхамі. Самы распаўсюджаны спосаб гульні: адзін з гульцоў хаваў у шапцы пэўную колькасць арэхаў, а іншы мусіў здагадацца, цотная ці няцотная колькасць арэхаў схавана. Абрам Паперна (Паперна, 2000: 31) прыгадвае, што дзятва Мсціслаўля катала арэхі з княжай гары, а Сямён Дубноў (Дубноў, 1998: 32) – што катвалі арэхі ў выкапаную для гэтага ямку.

**Этнаканфесійныя стасункі з аднагодкамі іншых народаў.** Мяркуючы па згадках, што пакінулі нам габрэйскія мемуарысты XIX – пачатку XX стагоддзяў, у часы іх дзяцінства (XIX стагоддзе) канфлікты паміж дзецьмі-прадстаўнікамі розных народаў былі, мала сказаць, нярэдкай з'явай. Частымі былі вайнушкі паміж юдэямі і хрысціянамі (Цетлин). Прыгадваюць мемуарысты і выпадкі нападаў на іх з боку хрысціянскіх дзяцей (напрыклад, Дубнов, 1998: 31–32). Разам з гэтым мы не сустракаем выказванняў аб "бандыцкім" нападзе габрэйскіх дзяцей на хрысціян. Прычыну гэтага, на нашую думку, можна шукаць у этнаканфесійнай сітуацыі ў краі, а таксама ў сітуацыі абмежаванасці грамадзянскіх правоў габрэяў у Расійскай імперыі. Дзёрская крыўда, нанесеная габрэйскім дзіцяцем хрысціянскаму, магла выклікаць адмоўны рэзананс з пэўнымі наступаствамі для ўсяго кагалу.

**Бацькі і дзеці.** На пачатку сваіх успамінаў Шалом-Алэйхем дае такую ўводную характарыстыку сваёй сям'і: "С детворой здесь не цацкались, то есть по детям особенно не скучали. И если бы они, не дай бог, не явились на свет, то беда была бы тоже не велика. Но раз они уже здесь, ничего не поделаешь – кому они мешают!" (Шолом-Алейхем, 1957: 5).

Цікавым для нас з'яўляюцца словы "кому они мешают", якія вельмі дакладна характарызуюць стаўленне большасці бацькоў да сваіх (часта шматлікіх) дзяцей у XIX стагоддзі. Бацькі мала займаліся выхаваннем сыноў-дачок, аб чым сведчаць самі мемуарысты (Копуст, 1867: 18). Хэдэр з'яўляўся і дзіцячым садком, і школай, а меламед быў асноўным вы-

хаваделем. Бацька ж, наадварот, быў як бы ў баку ад выхавання дзяцей. Таму маці асабліва гарэзлівых дзяцей пужалі не татам, а меламедам.

Фізічныя пакаранні былі асноўным метадам выхавання. Меламед лупцаваў сваіх вучняў сумленна і бязлітасна. Так было прынята, і аб гэтым пішуць усе мемуарысты (Паперна, 2000; Копуст, 1867 і інш.). А калі і лупцаванне не дапамагала (а яно рэдка дапамагала, бо дзеці даўно прызвычаіліся да тумакоў і аплявух), то меламед рабіў вучням унушэнні, палохаў геенай нябеснай. “Закостенелые упрямцы, мальчики от семи до десяти лет, пользовались погруженностью меламеда в геену и тем временем потихоньку резались в фантики” (Зингер, 2013: 59).

Нямала існуе стэрэатыпаў адносна дзіцячага свету габрэйскіх дзяцей. Сёння шмат кажуць аб тым, як старанна яны вучыліся і ад таго не бачылі нічога навокал, якімі кволымі і баязлівымі былі, як пакутавалі ад мардаванняў ката-меламеда. Дастаткова прыслухацца да галасоў мемуарыстаў, каб зразумець, што дзеці габрэйскай супольнасці XIX стагоддзя не былі такімі “зомбі”, якімі іх прынята ўяляць.

Безумоўна, скласці поўную карціну штодзённасці габрэйскага дзіця XIX стагоддзя на падставе даследвання толькі мемуарных крыніц не магчыма, але тым не менш, мемуарныя крыніцы даюць даследчыку вялікі пласт інфармацыі па дадзенай праблематыцы.

### ***Бібліяграфія***

1. Дубнов, Семен (1998). *Книга моей жизни.* Санкт-Петербург: Российский университет в Москве.

2. Зингер, Исроэль-Иешуа (2013). *О мире, которого больше нет.* Пер. с идиша под ред. В. Дымшица. Москва: Книжники.

3. Копуст, А. М. (1867). Воспоминания о недавнем прошлом. *Вестник Юго-Западной и Западной России. Т. 3., кн. 7.*

4. Паперна, Абрам (2000). Из николаевской эпохи. *Евреи в России, XIX век.* Москва: Новое литературное обозрение.

5. Цетлин, Соломон (1917). “Из дневника”, *Мишпоха,* 2006, № 18, URL (доступ: 08.07.2013): www.mishpoha.org /n18/ 18a06.php

6. Шолом-Алейхем (1957). *С Ярморки. Рассказы.* Москва: Государственное издательство художественной литературы.